

Максім Ялканаў

МАКСІМ ЯЛКАНАЎ

Дата нараджэння: 30 ліпеня 1991

Дата затрымання: 9 сакавіка 2021

Прад'яўленыя абвінавачванні:

арт. 342 Крымінальнага кодэкса — Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, што груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх

Вынік суда: 1 год і 7 месяцаў

Від пакарання: пазбаўленне волі ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму

Дата вызвалення: 29 ліпеня 2022

Суддзя: Салоўскі Сяргей, Бобыраў Вадзім

Пракурор: Курбацкая Ірына

Заява аб прызнанні палітвязнем

Максім Ігаравіч Ялканаў — жыхар Рэчыцы. Быў затрыманы на працы 9 сакавіка 2021 года і змешчаны ў гомельскі СІЗА-3.

Яго папрасілі праехаць для гутаркі да следчага, але на волю ён так і не выйшаў. Увечары 10 сакавіка з’явілася інфармацыя МУС пра ягонае затрыманне. У дачыненні да яго завялі крымінальную справу аб арганізацыі і падрыхтоўцы дзеянняў, якія груба

Падтрымаць «Вясну»

18 чэрвеня 2021 года суддзя **Сяргей Салоўскі**, які разглядаў справу, вынес Максіму Ялканаву прысуд. Ён пастанавіў прызнаць яго вінаватым у арганізацыі групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак і спалучаныя з яўным непадпарадкаваннем патрабаванням прадстаўнікоў улады. Салоўскі прызначыў Ялканаву пакаранне ў выглядзе **паўтара года пазбаўлення волі з адбыццём пакарання ў калоніі агульнага рэжыму**.

У лістападзе 2021 г. у судзе Рэчыцкага раёна адбыўся разгляд яшчэ адной справы супраць Максіма паводле **ч. 1. арт. 342 КК**. Суддзя **Вадзім Бобыраў** прызнаў палітзняволенага вінаватым і прызначыў яму канчатковы тэрмін зняволення **1 год і 7 месяцаў**.

Палітвязень адбываў пакаранне ў ПК № 17.

29 ліпеня 2022 г. Максім **выйшаў на волю**.



Паўтара года калоніі прысудзілі Максіму Ялканаву з Рэчыцы за тэлефанаванні сябрам і сваякам

У судзе Цэнтральнага раёна 18 чэрвеня скончыўся разгляд крымінальнай справы ў дачыненні да Максіма Ялканава, якога абвінавацілі ў арганізацыі ў Гомелі і Рэчыцы групавых дзеянняў, што груба парушаюць грамадскі парадак.



Два гады калоніі запрасілі для Максіма Ялканава за размовы па тэлефоне і паездку з сябрамі ў Гомель

У судовых спрэчках, якія адбыліся 14 чэрвеня, намесніца пракурора горада Гомеля Ірына Курбацкая сцвярджала, што віна Максіма Ялканава ў здзяйсненні тых дзеянняў, якія яму інкрымінуюць, даказваецца прызнальнымі паказаннямі самога абвінавачанага, а таксама запісамі тэлефонных размоваў і дэталізацыяй злучэнняў, паказаннямі сведкаў.



"Апаненцікі едуць". У судзе над Максімам Ялканавым з Рэчыцы дапыталі сведкаў

На працягу трох судовых пасяджэнняў праходзіў допыт сведкаў. Усе, каго дапытвалі – сябры Ялканава, якія былі разам з ім 10 жніўня 2020 года.



Жыхара Рэчыцы судзяць за тое, што сабраў знаёмых і паехаў з імі ў Гомель 10 жніўня

У судзе Цэнтральнага раёна Гомеля пачалі судзіць жыхара Рэчыцы Максіма Ялканава. Яго абвінавачваюць ў арганізацыі групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак (ч. 1 арт. 342 КК) па падзеях 10 жніўня.

У Рэчыцы затрымалі ўдзельніка пратэстаў з асяроддзя футбольных заўзятараў

29-гадовага маладзёна абвінавачваюць у арганізацыі групавых дзеянняў, спалучаных з непадпарадкаваннем міліцыянтам.



Падтрымаць «Вясну»

Палітвязні знаходзяцца па адрасах:



СІЗА-1
220030, г. Мінск, вул. Валадарскага, 2
123 палітзняволеных

СІЗА-7
224030, г. Брэст, вул. Савецкіх памежнікаў, 37
16 палітзняволеных

Следчая турма № 8
222163, г. Жодзіна, вул. Савецкая, 22А
32 палітзняволеных

СІЗА-6
225413, г. Баранавічы, вул. Брэсцкая, 258 В
13 палітзняволеных

Паказаць больш

Апошнія навіны

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева
26.04.2023

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі
26.04.2023

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні
26.04.2023

Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
26.04.2023

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя
25.04.2023

Больш навінаў

Падтрымаць «Вясну»

Што варта ведаць і як дапамагчы?

✉ Практычны дапаможнік па перадачах для вязняў ад “Вясны”

✉ Як зрабіць грашовы перавод зняволенаму?

✉ Наша сіла — ў салідарнасці! Вялікі дайджэст па дапамозе палітвязням

✉ Напішы ліст і адпраў паштоўку. Пра што і як пісаць?

✉ Як даслаць пасылку вязню і чаму гэта важна?

❤ Далучайся да ініцыятывы «Вызваленне-2020» (для родных палітвязняў)

🗣 Што чакае асуджаных па палітычных справах пасля абвяшчэння прысуду?

ВЯСНА праваабарончы цэнтр

viasna@spring96.org

Падтрымаць «Вясну»